БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне у ЗША
Published by Byelorussian - American Association, Inc.
Address — Адрыс: Byelorussian-American Association, Inc.
385 Alabama Ave, Apt. 17, Brooklin 7, New York, U. S. A.
Падпіска на год $ 2.50 — Subscription per year — $ 2.50
Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія

PRICE 10 ¢ ЧАСАПІС БЕЛАРУСАЎ У АМЭРЫЦЫ BYELARUS — WHITERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) NEWSPAPER IN THE USA 10 ЦЭНТАЎ

Год IV. № 20 (44) 7 Лістапада 1953 г. NEW YORK, N. Y., U. S. A. November 7, 1953 VOl. IV. № 20 (44)

Маршал Паулюс выплывае наузьверх

Усе свайго часу чулі аб нямецкім маршалу фон Паўлюсе, які, разьбіты чырвонай арміяй пад Сталінградам 10 год таму, трапіў у палон да камуністых, выкарыстоўваўся імі нейкі час, а тады, быццам, загінуў. І вось днямі гэты маршал нечакана знайшоўся й пачаў выплываць наўзьверх палітычнага жыцьця. Самперш, у савецкай прэсе зьявілася асьветчаньне фон-Паўлюса аб ягоным запраўдным „сяброўстве" з Савецкім Саюзам:

— „З дазнаньня дзьвух войнаў, — асьветчыў б. нямецкі маршал, які, між іншым, завецца ўжо не фон-Паўлюс, а проста, папралетарску, „таварыш Паўлюс", — я пераканаўся, што нямецкі народ ня можа будаваць сваю магутнасьць на прынцыпе гвалту. Спадзяваньні нямецкага народу на лепшую будучыню могуць быць зьдзейсьненыя адно шляхам сяброўства й супрацоўніцтва дэмакратычнае Нямеччыны з Савецкім Саюзам ды іншымі міралюбнымі краінамі". Сваё асьветчаньне Паўлюс закончыў словамі: „Я прыйшоў у Савецкі Саюз, як вораг, а варочаюся адтуль, як прыяцель".

Зварот марш. Паўлюса на палітычную арэну выклікаў рэха ў прэсе усяго сьвету. У тую пару (1944 г.) — піша, між іншымі, газэта „Нью-Ёрк Таймс", — ягоны пераход на бок Саветаў цяжка было-б зразумець. Але мінула блізу 11 год і сьвет шмат чаму навучыўся. Сяньняшняя паслухмянасьць Паўлюса ў дачыненьні да Масквы — зразумелая. „Прыладаў узьдзеяньня" на гэтага шчырага Гітлераўскага ваяку яна мела аж зашмат. 11 год палону, здалёк ад родных і блізкіх, здалёк ад сяброў і бацькаўшчыны, настырлівая савецкая прапаганда пры поўным няведаньні таго, што запраўды дзеіцца на сьвеце й шмат чаго іншага, аб чым мы можам толькі здагадвацца, зломяць волю абы-каго"... „У кажным разе сяньня Паўлюс паслухмяная прылада Крамля й яшчэ адна вузкая стаўка на памаценьне становішча Савецкага Саюзу ў Усходняй Нямеччыне".

Артыкул, прысьвечаны зьяўленьню Паўлюса, канчаецца словамі: — „Нямецкі народ ведае аб гэтым. Таму, вельмі сумлеўна, каб ён зьмяніў свае дачыненьні да Масквы толькі таму, што Паўлюс — гэтая жалюгодная рэлiквія мінуўшчыны выцягненая сяньня Масквою наўзьверх.

Дзяды

Хай кроў сьвятых ахвяр прад намі, на пяску
Караламі суніц жывых, чырвоных сьлее —
Ня хопіць ні злабы у ворага, ні куль,
Каб выпаліць з душы змагарнае надзею.
Не паддамося мы, хай ці адзін змагар
Яшчэ аддасьць жыцьцё за нас і за краіну,
Хай дагарым і мы — жыць будзе Родны Край,
Чароўны, ясны край, наш край прамення й сіні!

Дзяды — спрадвечнае асеньняе сьвята беларускага народу. Сьвята памяці памерлых продкаў, блізкіх і разам — сьвята ўраджаю. Дык у ім спалучаючыя амэрыканскія Memorial і Thanksgiving дні.

Мы сяньня далёка ад бацькаўшчыны і ад магілаў сваіх продкаў, блізкіх, суродзічаў. Але й на чужыне гэтае нашае спрадвечнае сьвята павінен кажны з нас адзначыць у сваёй душы ня менш шчыра й аддана, як гэта рабілі заўсёды ад тысячагодзьдзяў нашыя дзяды й прадзеды. І якраз сяньня мы маем асабліва шмат каго да памінаньня ў гэты дзень: і тых, што самі некалі адыйшлі ад нас ў вечнасьць, і самперш тых, што палі ахвярна ў змаганьні за народную справу.

Гады мінулай вайны асабліва шчодра, не шкадуючы, дасыпалі новую безьліч магілаў-капцоў па ўсёй шырокай беларускай зямлі. А магілы-ж нявінных мучанікаў расьлі ў нас і ня толькі ў вайну, але дзесяткамі гадоў ужо й перад вайною. І ня толькі на самой беларускай зямлі, але й далёка за ейнымі межамі, па ўсіх шляхох выгнаньня й катаргі беларускага народу.

Вось таму й страты беларускага народу за апошняе чвэрцьвечча вялізарныя. Яны ня тысячныя, а мільённыя. Людзі нішчыліся й нішчацца цяпер масава, штодзенна, хоць ніякія адмысловыя гасподы й нявыдавалі дзенных камунікатаў аб нашых стратах. Лік гэтых стратаў толькі ў мінулую вайну перарастае далёка ўсе амэрыканскія страты вайны сусьветнай і карэйскай, разам узятыя, хоць беларускі народ і меншы ад амэрыканскага ў разоў дзесяць.

У Беларусі сяньня няма ніводнай сям'і, ніводнага дому, зь якога хто-небудзь ужо не загінуў, ці дагарае яшчэ ў катаржных концлягерох. Усе шляхі савецкіх катаржных этапаў густа сяньня ўсланыя касьцямі й беларускіх выгнаньнікаў.

Ні каплі не перавялічана ў гэтых кароткіх, але як поўных крывавага гістарычнага трагізму радкох паэты:

Ой, пралягла чыгунка за Байкалам
паміж узгор'яў роўна, як абрус,
а ўздоўж па ёй пад кажнай тамка шпалай
ляжыць замучаны ў выгнаньні беларус.

І ведаем мы гэта добра, што ня толькі шпалы Забайкальля клаліся па магілах беларускіх зьняволеных ды выгнаньнікаў. Гэткімі-ж магіламі як-жа густа ўсыпаныя й усе іншыя шляхі нашага выгнаньня. Усланыя навет магіламі старых, жанок, малых дзяцей усе Сібірскія й нясібірскія дарогі пакуты й мучаніцкай сьмерці беларускага народу.

А побач із зьнішчанымі мільёнамі нявінных людзей шэрай штодзённай працы, сялян і работнікаў, якія аднячасна вялізарныя й нашыя культурна-духовыя страты! Ці ёсьць яшчэ іншы народ, на сьвеце які панёс столькі ахвяраў з культурные нівы ў выніку масавага ды плянавага народагубнага вынішчаньня радоў нашай вядучай нацыянальнай інтэлігенцыі, мастакоў, пісьменьнікаў, вучоных, найвыдатнейшых творцаў нашай навукі й нацыянальнай культуры.

Вось гэтыя вялізарныя сваім лікам і сваёй якасьцяй страты мінулых дзесяцігодзьдзяў беларускі народ, а разам і ўся беларуская эміграцыя, мае абавязак памінаць кажны год у часе нашых спрадвечных традыцыйных асеньніх Дзядоў. Памінаць ды прасіць цені мучанікаў за нашую народную справу, каб яны расхінулі сваю апеку над беларускім народам, каб былі духовымі правадырамі й апякунамі сучасных пакаленьняў у іхным наважаным змаганьні за тыя-ж сьвятыя правы, за зьдзейсьненьне волі беларускага народу.

І хай у часе асеньніх Дзядоў аднячасна з думкаю пашаны палеглым мільёнам лунае ў нас заўсёды й яшчэ адна думка — думка аб тым, што іхныя ахвяры не пайшлі на марна, што беларуская вызвольная справа за мінулыя гады ня толькі не занепала, але, надварот, значна змацавалася, падужэла.

Сіла й вага пытаньня вызваленьня беларускага народу, нягледзячы на цяжкія страты, упорыста расьце й на сваёй зямлі, і паза ёю, у міжнародным сусьветным жыцьці. Усё нішчанае ворагам тысячамі буйных парасткоў адрастае ізноў. Бярэ проста дзіва гледзячы на гэты упарты сталы рост, на тыя нявычэрпныя сілы беларускага творчага народнага духу й наважанай народнай волі жыць, жыць свабодна.

Вось за гэты няспынны рост нацыянальна-вызвольнай справы належыцца ўдзячнасьць і пашана ўсім жывым тым, што ад нас адыйшлі. Вось таму ў дзень спрадвечных нашых дзядоў на чужыне думкі ўсёй беларускай эміграцыі ўсіх краінаў сьвету павінны штогод лучыцца разам у нязгуннай пастанове ісьці цьвёрда й упорыста ахвярным шляхам тых, што загінулі ў змаганьні за тое, каб беларускі народ мог некалі ўрачыста спраўляць вялікія Вольныя Дзяды па ўсёй сваёй вольнай беларускай зямлі.

Б-іч.

Панмунджомская гульня

Перамовы прадстаўніка ЗША Артура Дына з чырвонымі у справе скліканьня прадугледжанае ўмовамі замірэньня карэйскае канфэрэнцыі, пачатыя колькі часу таму, безнадзейна зацягваюцца зь віны камуністых. З мэтаю дасягнуць якіх-колечы лепшых вынікаў у гэтай справе, Дын пагадзіўся навет на чарговыя новыя ўступкі чырвонаму Усходу. Як ведама, тымчасам парамовы разьбіваюцца з прычыны жаданьня чырвоных прадстаўнікоў, каб на будучую канфэрэнцыю, апрача прадстаўнікоў дзяржаваў — удзельнікаў Карэйскае вайны (пад чым яны й самі падпісаліся пры замірэньні) на канфэрэнцыю былі дапушчаныя „нэйтральныя" гаспадарствы, прыхільныя ім.

Дын, як быццам, пагадзіўся ўжо навет і на гэткія запросіны, але ён дамагаецца, каб раней былі вызначаныя час і месца канфэрэнцыі, а тады ўжо запрошаныя дадатковыя прадстаўніцтвы. камуністы-ж упіраюцца на сваім — раней запрасеце „нэйтральных", а тады, калі гэта нас задаволіць, будзем абмяркоўваць час і месца прадугледжанае замірэньнем канфэрэнцыі, накш кажучы, яны, не заладзіўшы яшчэ аднае спрэчкі, рыхтуюцца ўжо да іншае, усё, ведама, каб як адцягнуць справу міру дзеля сваіх собскіх, няведамых бліжэй мэтаў, аб якіх тым, што ведаюць савецчыкаў, могуць, аднак, дагадвацца.

Што гэткая, а ня іншая тактыка чырвоных, пабачылі ужо навет і вельмі наіўныя саюзныя дэлегаты. Гэтак, Дын асьветчыў быў днямі, што, паводле ягонага разуменьня, „камуністыя не зацікаўленыя ў пагадненьні. Яны выкарыстоўваюць паседжаньні камісіі выключна дзеля свае прапаганды".

Тымчасам справа „дабраахвотнае" рэпатрыяцыі чырвоных палонных, якая шырокім рэхам пракацілася па сьвеце, таксама не пасоўваецца нат крокам наперад. Пасьля адмовы большыні камісіі па рэпатрыяцыі (дэлегатамі Швэцыі, Швайцарыі і навет Індыі супраць „нэйтральных" Польшчы й Чэхаславаччыны) сілком, штыхамі ды вінтоўкамі гнаць палонных на „дабраахвотныя" „размовы" з камуністычнымі агентамі, „гутаркі" гэтыя што-раз часьцей адкладаюцца. Вялізарная большыня палонных наагул адмовілася „гутарыць" з камуністымі, у чым гэтыя апошнія абвінавачваюць ізноў... ЗША.

Справа Трыесту

Справа Трыесту паволі губляе сваю вайстрыню й непасярэдную небясьпеку. Саюзьнікі наважылі не сьпяшацца выходзіць з адданае імі Італіі зоны А, а Тыто, у сваю чаргу, хоць і бразгае яшчэ там-сям зброяй, згаджаецца на „ўступкі". Добра, відаць, разважыўшы палажэньне, ён наважыў лепш не адварачвацца ад Захаду, бяз грашовае дапамогі якога Югаславіі не абыйсціся й пагаджаецца ўжо на канфэрэнцыю пяцёх гаспадарстваў, у складзе ЗША, Францыі, Ангельшчыны, Італіі і Югаславіі дзеля заладжаньня канфлікту.

Аднак, апошнімі днямі Тыто ізноў пачаў нешта круціць. Справа ў тым, што з мэтаю выкарыстаць палажэньне, правадыры камуністычнае партыі націскаюць на Тыто, каб той перагледзеў свае дачыненьні да камінформу й Крамля і зьмяніў у выніку гэтага сваю дасюлешнюю вонкавую палітыку.

Ня трэба, хіба, казаць, што гэткая зьмена спыніла-б усе спадзяваньні Захаду на вайсковае супрацоўніцтва з Югаславіяй у рамах НЭЙТО, і была-б новай вялікай і нечаканай прыкрасьцяй для дзяржаваў Захаду.

У самым Трыесьце апошнімі днямі выбухлі непарадкі й разрух. У часе разруху былі забітыя саюзнай (ангельскай) паліцыяй тры італьянцы. У Рыме й інш. местах Італіі адбываюцца бурлівыя дэманстрацыі пратэсту.

Саветы не жадаюць пагадненьня

У адказ на прапанову заходніх дзяржаваў склікаць неўзабаве канфэрэнцыю чатырох вялікіх гаспадарстваў з мэтаю супольна заладзіць шмат якія пільныя палітычныя пытаньні, прыкладам, справы Аўстрыі й Нямеччыны, Саветы прыслалі днямі ноту, зь якое вымоўна, навет для наіўных заходніх палітыкаў відаць, што камуністым зусім не залежыць на нейкім заладжаньні набалелых справаў ці палагоджаньні напружанага міжнароднага палажэньня. Яны адмовіліся ад удзелу ў прапанаванай ім канфэрэнцыі 4-х, калі ня будуць самперш заладжаныя справы, на якіх Маскве залежыць — спыненьне ўзброеньня Нямеччыны, адмаўленьне ад НЭЙТО, адмова абмяркоўваць пытаньне Аўстрыі і патрабаваньне, каб у плянаванай канфэрэнцыі, прысутнічаў як 5-ты ўдзельнік, Чырвоны Кітай. Усе гэтыя дамаганьні Саветаў, як ведама, — не да прыняцьця, і, гэткім чынам, канфэрэнцыі з удзелам камуністых, відаць, ня будзе, хоць шмат хто, асабліва-ж Чэрчыль, да яе імкнуцца.

ЗН АБВІНАВАЧВАЮЦЬ КАМУНІСТЫХ У КРЫВАВЫХ ЗЬДЗЕКАХ НАД ПАЛОННЫМІ

Большынёю галасоў, камісія ЗН пастанавіла ўлучыць у парадак дня Агульнае Асамблеі ЗН абвінавачаньні супроць камуністых у крывавых зьдзеках над саюзнымі палоннымі ў Карэі.

Рашуча супрацівіўся гэтаму, як і трэба было спадзявацца, адзін Вышынскі, называючы абвінавачаньні супроць карэйскіх камуністых „злою хлусьнёю", „жудаснаю фабрыкацыяй" і „новай інтрыгай імпэрыялістых сьвету" у дачыненьні да „міралюбнага камуністычнага блёку народаў".

Непатрэбная трывога

Савецкі Саюз — краіна, якая шмат чым розьніцца ад іншых краінаў сьвету. Жыцьцё людзей там каштуе вельмі танна. Ніхто ня пэўны свайго лёсу, усе кажнае часіны могуць чакаць арышту, ссылкі, сьмерці. Аб гэтым ведаюць ужо навет на Захадзе. Што гэта так, сьветчыць узьнятая кагадзе на балонках друку трывога: дзе Молатаў? Што зь ім, ці ён жыве? Прычынаю гэтых непакояў заходніх палітыкаў аб лёсе свайго савецкага калегі была тая, што напрацягу апошніх 3-4 тыдняў імя Молатава чамусьці перастала зьяўляцца на балонках савецкіх газэтаў. На ўзьверх, замежныя прадстаўнікі, якіх звычайна прыймаў сам Молатаў, былі напрацягу ўсяго гэтага часу прыйманыя ня ім, а ягоным заступнікам. Гэтага было досыць, каб пачалі кружыць плёткі, чуткі й здагадкі — ці ня сустрэў Молатава лёс ягонага былога сябры Бэрыі? Ці не дапамаглі яму памярці, як Сталіну? Але, на гачасьце, ці на жаль, усе згаданыя непакоі, пакуль што, прынамсі, былі надарэмныя, бо вось у савецкіх газэтах ужо зьявілася паведамленьне, што ў дзень Кастрычніцкае гадавіны, у сыботу 7-га лістапада, Молатаў ладзіць вялікі дыпляматычны банкет для дыпляматычнага корпусу.

АХВЯРЫ НАЦЫСКАГА ЛАДУ

У архівах нямецкага галоўнага камандваньня, як паведамляюць з Усходняе Нямеччыны, былі знойдзеныя афіцыйныя дакуманты й сьпісы асобаў, расстраляных нацыстымі напрацягу 1938-45 г. г. У сьпісах гэтых, быццам, пералічаныя ймёны 25 тысячаў чалавек, расстраляных пераважна за „варожыя дачыненьні да вайны".

Аб тым, колькі мільёнаў ахвяраў нацызму — **ня немцаў** былі забітыя й замучаныя напрацягу згаданых год — у паведаменьні не гаворыцца.

СЬВ. ✝ ПАМ.

ПРЭЗЫДЫЮМ РАДЫ БНР

зь вялікім сумам паведамляе беларускае грамадзтва аб перадчаснай сьмерці свайго дарагога сябры

інж. ЛЯВОНА РЫДЛЕУСКАГА

Доўгагадовага сакратара Прэзыдыюму Рады й сябры Рады БНР з 1936 году, былога міністра Працы Ураду БНР у 1948-50 г. г.

Паніхіда па Нябожчыку адбудзецца ў нядзелю, 15-га лістапада ў царкве Сьв. Тройцы, на 4-ай Іст вуліцы ў Нью-Ё[illegible]

Вечная яму памяць.

Прэзыдыюм Рады БНР

НАВОШТА ГЭТА РОБІЦЦА

ЦК АБНД (Цэнтр Арганізацыі Беларускіх Нацыянал-Дэмакратаў) выдала абежнік № 2 (за верасень), у якім паведамляецца аб заятым ЦК Партыі становішчу у дачыненьні да запланаванага у Мюнхэне Міжнацыянальнага Антыкамуністычнага Кардынацыйнага Цэнтру, г. зв. МАКЦ-у.

Бясспрэчна, ніхто ня можа адмовіць ня толькі якой-колечы беларускай партыі, але й кажнаму беларусу права выступаць з крытыкай і займаць сваё становішча да так паважнай акцыі, як тая, што пачатая прадстаўнікамі 9-ёх народаў сяньняшняга СССР у Мюнхэне, а ў тым ліку й прадстаўнікамі беларусаў.

Дзіўнай і незразумелай затое зьяўляецца прычына, дзеля якой аўтарам згаданага абежніка так залежыць на скампраметаваньні удзельнікаў Мюнхэнскай Канфэрэнцыі (дый ня толькі удзельнікаў), прычэпліваючы ім этыкеткі „апартуністых", прарасейцаў і г. д.

Выступ ЦК АБНД тым болей загадкавы, што надаваныя ім нам дзеля чаецьці этыкеткі „апартуністых", русафілаў і г. д. — пабудаваныя на чысьцейшых дэмагагічна зьлепленых довадах, із трушанкі панабіраных із статуту былога КЦАБ-у выразаў, прыпісваных — МАКЦ-у.

Вось для прыкладу колькі такіх „аргумэнтаў" з прыгаданага абежніку:

— „Палітычная пляцформа і агульныя палажэньні МАКЦ-у, — пішуць, аўтары, абежніку, аснаваныя на канцэпцы расейскай лютаўскай рэвалюцыі 1917 году. (Пункт 1 абежніку)!?

— „Праграма вызваленьня народаў, што засяляюць прастору сяньняшняга СССР паводле палітычнай пляцформы МАКЦ-у нічым ня розьніцца ад праграмы КЦАБ-у: сьпярша поўнае (г. зн. на цэлым прасторы СССР) зьнішчэньне камуністычнай дыктатуры, пазьней — правязеньне прынцыпу пасьлядоўнага народаўладзтва (г. зн. пасьля стварэньня й умацаваньня цэнтралістычнае расейскае улады, абяцанкі „плебісцыту" ці скліканьня усерасейскага Установчага Сходу)". (Глядзі разьдзел 1 (б). абежніку) (!?).

Пэўне-ж будзе лішнім прыгадваць і тыя „высноўкі" аўтараў абежніку, якія хоць і робяцца на аснове праўдзіва запытаваных пунктаў статуту МАКЦ-у, але якія нельга назваць накш, як буйной фантазыяй і ніколі здаровай лёгікай.

Словам, і фантазія й тэндэнцыйныя падтасоўкі — усё змабілізаванае дзеля таго, каб давесьці „апартунізм" і „зраду" аўтараў статуту МАКЦ-у.

Праўда, у пункце 4-ым абежніку аўтары ягоныя выяўляюць свой сумлеў і зьдзіўленьне, „як маглі прадстаўнікі Рады БНР разам аж з пяцьма іншымі вярхоўнымі органамі нацыянальна-вызвольных рухаў нерасейскіх народаў цаною гэткіх недапушчальных уступкаў аднэй мізэрнай расейскай групе (да таго-ж марксісцкай), якая ні ў якой меры не рэпрэзэнтуе расейскага народу, ісьці на тварэньне такога супольнага блёку, як МАКЦ".

Вось-жа, калі-б ЦК АБНД паставіла, пішучы свой абежнік, сабе гэтае пытаньне „ЧАМУ" не чацьвертым пунктам, а першым, і добра ўдумалася — ЧАМУ тыя, „рэпрэзэнтуючыя" расейскі народ партыі — Керанскага, Мяльгунова й „іже с ними" расейскія шавіністыя ўзьнялі гэткі лемант і шум супраць статуту МАКЦ-у, чаму запратэставалі перад амэрыканцамі супраць прызнаньня імі МАКЦ-у й усе іншыя прадстаўнікі расейскае чорнае сотні, калі-б ЦК АБНД добра падумала ЧАМУ ўсе гэтыя расейцы адмовіліся прыняць нашу „апартунізм", нашую „зраду" — дык, магчыма, аўтары абежніку знайшлі-б адказ на гэтае сваё „ЧАМУ" й не апынуліся-б па адным баку з Керанскім і Со ў супольным паходзе супраць МАКЦ-у.

На жаль, лідары АБНД зрабілі накш. Заместа таго, каб абараняць пазыцыі „вярхоўных органаў нацыянальна-вызвольных рухаў нерасейскіх народаў", асягненыя імі пасьля цяжкога змаганьня, — яны намагаюцца зрабіць усё, каб аслабіць пазыцыі „прадстаўнікоў Рады БНР" як перад іхнымі саюзьнікамі — не амэрыканцамі, гэтак і перад амэрыканцамі.

Таму мы й пытаемся ў паважных лідараў БНДП у сваю чаргу. Чаму й навошта гэтак робіцца?

М. А.

Камунікат БАПЦарквы

Гэтым паведамляем Усечэсное Духавенства, Царкоўныя Камітэты й грамадзкія Арганізацыі, што Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіяпіскап Сергій разам з Епархіяльнай Управай склікае на 25-26-га сьнежня г. г. у Сіднэі, Аўстралія, Царкоўны Зьезд БАПЦарквы з наступным парадкам дзённым:

1. Урачысты Малебен. 2. Адчыненьне нарадаў Зьезду. 3. Выбар Мандатнай Камісі. 4. Выбар Прэзыдыюма Зьезду. 5. Даклад Высокапрэасьвяшчэньнейшага Архіяпіскапа Сергія: „Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква". 6. Справа сьвяшчэнаслужыцеляў БАПЦарквы. 7. Усходні Патрыярхат і Б. А. П. Ц. 8. Нашае Духавенства й арганізацыя Прыходаў. 9. Выбар Епархіяльнае Управы БАПЦ для Аўстраліі й Нова-Зэляндыі. 10. Інфармацыйныя справаздачы з месцаў. 11. Дыскусія над справаздачамі. 12. Бягучыя справы духоўнага й адміністрацыйнага характару па Епархіі. 13. Вольныя прапановы.

На дзень 26-га сьнежня.

1. Саборная Багаслужба Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіяпіскапа Сергія ў асысьце Духавенства Епархіі.

2. Даклад на тэму: „Сьвятасьці Беларускага Народу" Даната Яцкевіча.

3. Зачыненьне нарадаў Зьезду супольнай Малітвай.

Вітаючы гэты наш Царкоўны Зьезд у Аўстраліі, просім Усечэсное Духавенства, Царкоўныя Камітэты й грамадзкія Арганізацыі таксама горача прывітаць яго. Прывітаньні просіцца пасылаць на адрыс Сакратара Епархіяльнае Управы БАПЦ у Аўстраліі:

Danat Jackievič, 60 Fisher St., East Brisbane, Qld. Australia.

Сакратар Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў БАПЦ на Чужыне

† Япіскап ВАСІЛЬ

Беларусы таксама каналі з голаду на Украіне

(Да голаду на Украіне ў трыццатых гадох)

Калі спрытнага маскаля можна было бачыць на кажнай станцыі „неаб'ятнай родны", дык сьціплага, прывязанага як і украінец, да роднае хаты беларускага селяніна можна было сустрэць хіба на станцыі Крамянчуг, які ляжыць на шляху з Беларусі ў Данбас і Крывы Рог, ды й то ўжо ў часы вынішчэньня чырвонай Масквою паняволеных народаў.

Ратуючыся ад сьмерці на катарзе й ссылцы, беларус ішоў у капальні, дзе з прычыны вельмі цяжкое працы, адміністрацыя праз пальцы глядзела на паходжаньне чалавека.

Але улетку 1934 году напрацягу колькіх месяцаў вуліцы й пляцы каля станцыі Крамянчуг былі рудыя ад жоўтачырвоных беларускіх кажухоў. Тысячы худых, галодных людзеў, мужчынаў і жанок з дзецьмі тыднямі качаліся на засьмечаных бруках.

Гэта беларусы ўцякалі на сваё роднае Палесьсе, не з капальняў, але з Хэрсонска-Запарожскіх стэпаў.

Бо на месца вынішчаных голадам украінцаў, у пачатках 1934 г. Масква была пагнала цэлымі вёскамі на Украіну беларусаў, каб засяліць імі пустыя украінскія сялібы.

Калі-ж галеча у напоўразбураных хатах украінскіх сёлаў пачала забіраць ахвяру за ахвяраю й сярод пераселеных беларусаў, — дык гэтая людзкая маса рынула на Крамянчуг да чыгункі ў Беларусь. Ніякая моц, ніякія пагрозы не маглі паўстрымаць жаданьня беларуса вярнуцца на Бацькаўшчыну. Улады змушаныя былі фармаваць транспарты, каб якнайхутчэй ліквідаваць вынікі свайго няўдалага дасьветчаньня, ад якога сотні галодных памíралі тут-жа, на пляцы перад чыгуначаю станцыяй.

Украінскае жыхарства ня мела магчымасьці дапамагчы нешчасьліўцам, бо голад дакучаў усьцяж і мясцовым жыхаром.

Не забыцца мне сцэны, якую я пабачыў аднойчы на згаданай станцыі. Беларуская сялянка з малым дзіцем на руках, што прасіла „хлебца", паднесла была яго да нейкага падарожнага. Жанчына, што стаяла побач, падала дзіцяці акрайчык. У гэты-ж момант нейкі зьвер у мундзеры лейтэнанта чырвонае арміі, вырваў гэты кусочак хлеба з маленькае дзіцячае ручкі й кінуў у лужыну із словамі: „работать надо, а не пабираться" (працаваць трэба, а не жабраваць).

І. Аўсянік („Свобода", жнівень 1953 г.)

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ І ПАШЫРАЙЦЕ ГАЗЭТУ „БЕЛАРУС".

Што значыць... бяз трэніроукі

(з жыцьця „беларускіх фэдэралістых")

Як ведама, расейскія адзінанедзялімаўцы вырашылі апошнім часам, што ў сваёй дывэрсыйнай працы сярод беларусаў нельга абыйсьціся таксама й без „беларускіх фэдэралістых". Паводле гатовага ўзору „фэдэралістых украінскіх", яны пачалі спробы стварыць у нас падобны „рух".

Але на беларускім полі заданьне гэтае сталася для расейцаў шмат цяжэйшым. Ім не ўдалося навет адшукаць сярод беларусаў гэткага гагунку людзей, як украінскі Гулай, Багатырчук ці Дзікі, у сэнсе іхнае інтэлігенцыі і палітычнага „спрыту". Давялося задаволіцца тым, што трапіла пад рукі й пусьціць у „акцыю", бо час не цярпеў. Прыгэтым пусьціць без патрэбнае падрыхтоўкі — чаму вось справа й дала зусім скандалічныя для арганізатараў, як расейцаў, гэтак і для самых „нашых", „фэдэралістых" вынікі.

Прыгадаем тут хоць-бы першую арганізацыйную сходку „беларускіх фэдэралістых — дэмакратаў" у Мюнхэне ў лютым г. г., калі спозьненыя на „жанфэрэнцыю" два „рэпінцы", каб давесьці расейцам сваю „шчырасьць", не зьрыентаваўшыся яшчэ ў палажэньні, кінуліся былі на навешаныя над пагоняй беларускія сьцягі з крыкам „ўбраць эті сепаратические тряпки" і прысутным расейцам давялося выступіць у абароне беларускага сьцягу, угаварваючы „беларусаў" не пратэставаць, бо „это так нужно".

Нешта гэткае паўтарылася ніядаўна і ў Нью-Ёрку.

Тут, як ведама, „паўстаў" быў колькі тыдняў таму таксама „беларускі фэдэральны рух", да ўраду якога быў выбраны старшыняй нейкі Баранцэвіч, сябрамі ўраду добра ведамы з Лёндану „праваслаўны паляк" а. Краўчанка, нейкі Родзевіч, а рэвізыйнаю камісіяй — дачушка Баранцэвіча.

Неўзабаве ў кватэры Баранцэвіча адбыўся невялікі баль, прысьвечаны дню народзінаў Баранцэвічавай дачушкі, а побач із гэтым і „замоўныя" новага ўраду, — падзея не абы-якая, бо-ж „падвойнае сьвята". На ўрачыстасьць былі запрошаныя й лідары іншых фэдэралістых народаў Расеі. Як першы тост урачыстасьці было запрапанавана выпіць за „адзіную й недзялімую Расею. Прысутны на банкеце „украінец" Дзікі, відаць не даваючы некаторым незнаёмым гасьцём, пачаў далікатна папраўляць Баранцэвічышку, якая ўзьняла была гэты тост, і ўрэшце запрапанаваў ёй выпіць і за Беларусь. Аднак, Баранцэвічышка упіралася, намагаючыся давесьці, што й яна й яе — „папка" заўсёды стаялі й стаяць „за адзіную Расею". Дзікі, стараючыся супакоіць прысутных, што іх фэдэралізм не так ужо пагражае единонеделимской ідэі Расеі... і спрэчка заціхнулася. Вынікі „лекцыі-тактыкі" Дзікага усё-ж былі ніякія, аб чым выемна засьветчыў выступ „вядомага беларускага дзеяча" Баранцэвіча на мітынгу, наладжаным колькі дзён пазьней, бо 11-га кастрычніка, „аб'яднаньнем фэдэралістых народаў Расеі".

Атрымаўшы голас, Баранцэвіч пачаў бэсьціць Беларусь і беларускі народ, даводзячы, што ў Беларусі нічога добрага няма, што, хоць Абрамчык і „распісваўся ў „Бацькаўшчыне" аб прыродных багацьцях Беларусі", — гэта ўсё мана, бо народ у Беларусі цёмны, някультурны, а усё што ў Беларусі ёсьць—гэта балота ды пясок, што ён ніякай Беларусі ня хоча і г. д.

Гаворачы гэта, „прамоўца" запыняўся, паўтараўся, шукаў словаў,.. а нарэшце пачаў перапрашаць аўдыторыю, што зь яго благі аратар, што ён упяршыню выступае на палітычным мітынгу й г. д., на што публіка адказала сьмехам і кпінамі.

Дзікаму давялося й тут выступіць з прамовай, якая мелася памяншыць тае прыкрае ўражаньне прысутных аб сваім калегу "беларусе", ці лепш кажучы, якколечы паправіць запраўды скандалічную кампрамітацыю „фэдэралізму".

Але сталася яшчэ горш. Калі Дзікі у сваёй прамове заяцеміў, што вырашэньне нацыянальных пытаньня будзе перадана усенароднаму плебісцыту, у гэты момант з першых лавак ускочыў быў іншы беларускі „фэдэралісты" — бацюшка й перабіваючы Дзікага, выкрыкнуў з усяе моцы: „да нікакіх плебісцытаў мы беларусы не хотим", і пачаў лаяць Дзікага, абзываючы яго гэткім-жа, як рэшта сэпаратыстых, фашыстых, „расчленіцелем Расеі". А на ўзьверх, перапыняючы лаянку, ён яшчэ раз паўтарыў, сваё катэгарычнае запэўненьне, як беларусы наагул ня хочуць ані асобнага ураду, ані фэдэрацыі, ані аўтаномнага урадa, а толькі ўліцца ў адзіную расейскую дзяржаву.

Гэткія словы другога „беларускага фэдэралістага" выклікалі на залі ўжо ня толькі сьмех і кпіны слухачоў, але й пратэсты ды дамаганьні слова дзеля адказу.

Разгублены Дзікі пачаў супакайваць публіку, кажучы, што мітынг ужо канчаецца, бо трэба звальняць залю, што слова прысутным будзе дадзеная на адным з наступных сходаў, што на сяньня досыць і г. д. і на гэтым першы „міжнацыянальны мітынг фэдэралістых" быў зачынены.

Што й казаць, — ён ня ўдаўся і добрага ўражаньня не пакінуў ні ў кім з прысутных. А трэба дадаць, што на залі было каля сотні людзей, у тым ліку й амэрыканцы-сымпатыкі фэдэрацыі народаў Расеі.

Але ведама — "першы блін комам" як кажуць расейцы, ці „першы блін — сабаку", — як кажуць у нас. Сапраўдні-ж гэты „першы блін" якраз нявыпечаныя „беларусы". Трэба спадзявацца, што наступным разам усё пойдзе гладзей.

Прысутны.

ПАМЯТНІК КАМПАЗЫТАРУ МІКОЛЕ РАВЕНСКАМУ

Каардынацыйны Камітэт Беларускіх Арганізацыяў у Бэльгіі выдаў, як ведама, заклік у справе зьбіраньня грашовых ахвяраў на памятнік на магілу памёрлага сёлета кампазытара Міколы Равенскага. Управа Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва із свайго боку заклікае як сваіх сяброў, гэтак і ўсе беларускую эміграцыю падтрымаць гэты добры пачын. Ныбожчык камп. Равенскі, як сьвятары ведама жывая цесная сувязь з Управаю БІНіМ да апошняга дню жыцьця, быў актыўным сябрам Інстытуту. Грошы на памятнік трэба кіраваць на адрыс:

S. Mak, 19 Place Hooevr, Louvain, Belgique.

Ванo Нануашвілі

Магутнасьць і слабасьць Расеі

(Заканчэньне)

Чаму гэткая рэч не ўдалася немцам у часе апошняе вайны й што выявіла ў гэтай справе яна сама?

Паняволеныя народы змагаюцца за сваю незалежнасьць. Ні адзін з гэтых народаў ня можа пагадзіцца з тым, каб ягонае адвечнае змаганьне за волю роднага краю скончылася адно зьменаю акупанта ці паняволіньня. Для паняволеных народаў змаганьне зь кім колечы ня мае ніякага сэнсу, калі яно ня мае за мэту аднаўленьне дзяржаўнае незалежнасьці. Кажнае нішае змаганьне зьяўляецца для іх адно непатрэбнай ахвяраю й недарэчнасьцяй. Гэтага вынікае што кажны народ мусіць і будзе імкнуцца якхутчэй спыніць бязмэтныя ахвяры. Сэнс існаваньня й ягоны здаровы розум кажнаму зь іх затое нешчае: наважаіе выступленьне кажнага новага чаргова заваёўніка.

Гаворачы іншымі словамі, ні з новых заваёўнікаў, ні адно захопніцкае гаспадарства, якое само мае намер захапіць згаданыя прасторы й пераняць пад сваё панаваньне паняволеныя народы — ніколі не патрапіць узбудзіць у іх сьмяротнае ненавісьці да расейска-камуністычнага ладу, а хутчэй узбудзіць яе ў дачыненьні да сябе самога. Гэтак якраз сталася й з немцамі, якія, змагаючыся з чырвоным тэрорам, былі самі прадстаўнікамі найгоршага на сьвеце гатунку імпэрыялізму.

І не патрэба навет напамінаць аб усім тым, што яшчэ жывое ў нашай памяці, бо ўсе мы ведаем аж за добра, што ў сваёй тупой і прымітыўнай дзікасьці патрапіла даць нам пазбаўленая інтэлігэнцыі, прымітыўная арыстакрацыя партыі нацыстых.

Сама ідэя „Herrenvolk-у", выпладзеная дзеля штучнага трыманьня нямецкага народу на ўзроўні надлюдзей, мусіла прывесьці да вынішчэньня інтэлігенцыі ня толькі ў народах, што былі найбліжэйшымі суседзямі Нямеччыны, але і ўсіх наагул народаў, зь якімі яна сутыкалася. І гэта адно рабіла недарэчнасьцяй кажнае супрацоўніцтва зь Нямеччынай.

Праўда, у першым этапе вайны, паняволеныя народы ў сваім супрацьрасейскім уздыме далучыліся былі да немцаў. Аднак першыя блізкучыя перамогі й адзнакі гвалтоўнага разкладу расейскае арміі зрабілі гэткае ўражаньне на немцаў, што яны зусім перасталі хавацца із сваімі далейшымі плянамі ў дачыненьні да паняволеных народаў, і вынікам гэтага была ужо неўзабаве дружная супрацьакцыя згаданых народаў.

Сяньняшняе агульнае палажэньне сьвету яснае й простае. Расея стаіць над ім, прыгатаваная да скоку, які мае даць ёй канчальнае панаваньне над усімі краінамі й народамі. Яна мусіць зрабіць гэты скок, бяз розьніцы колеру свайго дзяржаўнага ладу. І мусіць усімі сіламі бараніцца перад вынікамі гэтага непазьбеглага расейскага скоку рэшта сьвету, кіраваная дзеля гэтага сьмяротнага змаганьня адзінай рэальнай моцай нашых часаў — народамі англа-саксонскага паходжаньня, сярод якіх першую ролю граюць бясспрэчна ЗША.

Час чаканьня на згаданую расейскую атаку ўжо вельмі кароткі й выразна абмяжаваны. Чым даўжэй будзе на яе бясчынна чакаць Захад, тым хутчэй зялезная заслона, якая шчыльна дзеліць сяньня Эўропу на дзьве часткі, давядзе сьвет да поўнай эканамічнай катастрофы.

З свайго боку, Расея таксама не захоча змарнаваць існуючую, вылучна спрыяльную для яе палітычную кан'юнктуру, бо не патрапіць пазьней нічым вярнуць назад вартасьць згубленых пазыцыяў.

Як-жа выглядаюць магчымасьці абедзьвюх прыгаданых старон?

Расея ня мае собскае чыннае моцы, здольнай зьнішчыць у змаганьні ваенным магутнасьці англа-саксонскіх народаў. Яна можа, праўда, разьлічаць на некаторую ўдачу сваіх прапагандных лёзунгаў, на дынамізм сваіх агентаў у той ці іншай краіне, на часовую абыякавасьць жыхарства гэтых краінаў у выніку доўгатрывалае вайны... Можа яна разьлічаць і на вельмі спрыяльнае для яе палітычнае палажэньне на прасторах Эўропы, якое, аднак, дзень па дні зьмяняецца на ейную некарысьць.

Абапіраючыся на прыгаданых элемэнтах, Расея магла-б атанаваць большаю часткаю Эўропы й Блізкога Усходу, але давесьці справу да канца усё-ж-бы не патрапіла, пакідаючы ў сваёй уяўнай здольнасьці выкарыстаньня падбітых народаў.

Наадварот, народы Захаду з усёй пэўнасьцяй могуць цалкам здэмаралізаваць і зьнішчыць збройную моц і дзяржаўны апарат Расеі й то адно тымі сродкамі, якія былі імі ўжываныя ў часе апошняе вайны, не гаворачы ўжо аб апошніх дасягненьнях сучаснае ваеннае тэхнікі.

Калі-ж бы яны патрапілі скарыстаць яшчэ й палітычнае супрацоўніцтва паняволеных народаў, шлях да перамогі быў-бы для іх адчынены бяз усялякага сумлеву, бо магутны дынамізм прыгаданых народаў дазволіў-бы ім апанаваць вялізарныя прасторы, што складаюць магутнасьць Расеі й дагэтуль ратуюць яе ад вынікаў вечных ваенных паразаў.

Змагар за долю іншых

(Памяці Лявона Рыдлеускага)

Сьпі пад курганам герояў,
Сьпі, працаўнік і змагар..

У нядзелю 25-га кастрычніка надляцела ў Ню-Ёрк сумная вестка, што напярэдадні, у суботу 24-га, у Лёндандскім шпіталі Сьв. Каламбаса адыйшоў ад нас назаўсёды ведамы беларускі дзеяч інж. Лявон Рыдлеўскі.

Сьв. памяці інжынер Рыдлеўскі належыў да тых беларускіх грамадзка-палітычных дзеячоў, якія, прысьвяціўшыся ідэі змаганьня за незалежнасьць Беларусі — выракліся сваіх прыватных справаў і асабістага жыцьця, непамерна скарачаючы гэтым свой век ды адыходзячы ад нас перадчасна. Ён адыйшоў ад нас адно на колькі тыдняў перажыўшы сваё пяцідзясятыя ўгодкі.

Нарадзіўся Лявон Рыдлеўскі 2-га кастрычніка 1903 г. ў м. Ульянавічы на Магілеўшчыне, як трэці сын у сям'і.

Яшчэ задаўга перад першай сусьветнай вайной (недзе ў 1908 г.), бацькі Рыдлеўскага пераехалі былі ў Слуцак, дзе набылі сабе дамок і асяліліся наста. Стары Рыдлеўскі, які быў дробным расейскім урадаўцам, цікавіўся й спачуваў беларускаму нацыянальна-вызвольнаму руху, выпісваў газ. „Наша ніва" й хоць сам ня браў актыўнага ўдзелу у беларускай працы, аднак, патрапіў стварыць у сям'і атмасфэру шчырага беларускага патрыятызму. Два старэйшыя браты Лявона, апынуўшыся неўзабаве ў Маскве, не маглі, праўда, нічым праявіць яго, але малодшы, найдаўжэй застаючыся пры бацьках, неагляндна пайшоў зь вірам беларускага жыцьця.

Калі ў 1920 г. выбухла Слуцкае Паўстаньне, 17-цёхгадовы Лявон быў вучням 7-ае клясы Слуцкае беларускае гімназіі. На заклік Рады Случчыны „да зброі" Лявон, не разважаючы, кідае школу й з дазволу бацькі записвецца дабраволыцам у беларускую армію. Апынуўшыся праз пару дзён на фронце, хоць і зусім нявышкаляны вайсковa, ён удзельнічае ў усіх цяжкіх баёх супраць бальшавіцкае навалы, а пасьля партызанскім спосабам з рэштаю сяброў-недабіткаў свае роты, змагаецца блізу месяц, блукаючы па Палесьсі й нападаючы зьнячэўку на акупанцкія банды.

Прыціснены нарэшце бальшавікамі да тагачаснай „польскай" мяжы, група Случчакоў да якое належыў і малады Рыдлеўскі, пераходзіць Рыскую мяжу й трапляець у рукі палякоў, якія іх абязбройваюць й інтэрнуюць.

Упрыгшыню я сустрэўся із Лявонам Рыдлеўскім улетку 1921 г. на Беларускіх Настаўніцкіх Курсах у Вільні. На гэтых курсах было каля 20-цёх случчакоў, усе ў парванай вайсковай вопратцы, але поўны юнацкага запалу, трымаючыся заўсёды разам, як-бы ўсьцяж рыхтуючыся ў супольны паход супраць ваяўніка. Рыдлеўскі вырозьніваўся з гэтае грамадкі толькі сваёй маладосьцяй. Быў гэта худы дзяцюк у завялкіх, цяжкіх вайсковых ботах і даўгім палатаным шынялі, які быў яму й вопраткай і коўдрай, бо случакі нашыя ня мелі ў тыя часы іншага прыпынішча, апрача невялічкага склепу ў панадворку Базыльянскага мурoў, бяз дзьвярэй і бяз печы, ды й то — прыпынішча нелягальнага.

Скончыўшы Настаўніцкія Курсы, случчакі настаўніцкіх пасадаў не атрымалі, бо палякі пачалі ўжо ліквідацыю беларускага школьніцтва й на новыя пасады нікога ня вызначалі. І хлопцы пачалі разыходзіцца, хто куды... Адны перайшлі ў Летуву, дзе фармаваліся кадры беларускіх партызанскіх аддзелаў са штабам у Таўрагэнах, іншыя хаваліся па вёсках Віленшчыны, Рыдлеўскага-ж, як наймаладзейшага, удалося ўсадзіць у інтэрнат пры Віленскай Беларускай Гімназіі, каб даць яму магчымасьць закончыць сярэднюю асьвету.

Інтэрнат, ці лепш кажучы прытулак пры Беларускай гімназіі быў вялікі. Утрымліваўся ён выключна з ахвяраў беларускіх сялянаў у форме зборкі збожжа. Харчы там былі з гэтае прычыны вельмі слабыя. Бывала, што дзятва й моладзь тыднямі харчавалася адно паліўкаю ці заціркаю, ня бачачы хлеба.

Жывучы ў гэткіх цяжкіх умовах, Лявон Рыдлеўскі канчае 7-ую, а тады 8-ую клясы й бярэ актыўны ўдзел у беларускім тагачасным вызвольным руху, а асабліва ў нелегальным друкарстве і распаўсюджваньні канфіскаваных палякамі нумароў беларускіх газэтаў ды працы лучнікам паміж нашымі партызанамі з Таўрагэнаў і партызанамі, замаскаванымі ў Заходняй Беларусі.

Пасьля сканчэньня Віленскае гімназіі ўвосені 1923 г., Рыдлеўскі пераходзіць нелегальна ў Чэхаславаччыну, дзе із дапамогаю Пасольства Ураду БНР атрымлівае неўзабаве стыпэндыю на Праскай Палітэхніцы, якую й канчае ў 1928 г. із тытулам дыпляманага інжынера агранамічных навукаў. Але як чужынец, ён не атрымлівае паводле чэскіх законаў, права практыкі й запісваецца ізноў на студы на эканамічны факультэт, дзе вывучае сельска-гаспадарчую эканомію напрацягу году, але ўжо бяз стыпэндыі.

У часе свайго 6-цёхгадовага пабыту ў Чэхіі, Рыдлеўскі заўсёды стаяў у перадавых радох беларускага студэнцкага актыву.

Праўныя й матар'яльныя абставіны ў Чэхаславаччыне змусілі інж. Рыдлеўскага шукаць працы й прытулку за межамі гэтае, хоць прыхільнае, але цеснае для чужынцаў краіны. Варочацца ў Польшчу, або ехаць у СССР, куды бальшавікі тым шырака адчынялі дзьверы для маладых спэцыялістых, Рыдлеўскі не змянула. І вось, улетку 1929 г. ён наважвецца, разам з аўтарам гэтых радкоў, ісьці пехатою на захад. За паўгоду ён даходзіць да Ліёну ў Паўдзённай Францыі, зарабляючы тут і там фізычную працаю сабе на хлеб. Часы гэныя былі вельмі цяжкія. Агульны сусьветны гаспадарчы крызыс быў у поўным сваім цьвіценьні. У Нямеччыне лічылася каля 6 мільёнаў беспрацоўных. Знайсьці якую-колечы сталую працу было для чужынца справай фантастычнай. А жыць трэба было.

У Францыі умовы для чужынцаў былі ў тыя часы таксама няспрыяльныя. Хоць беспрацоўе тут было меншае, але законы што да права на працу больш жорсткія. Аднак, ісьці далей ня было куды і, сутыкнуўшыся із шэрагам асяродзьзяў беларускае працоўнае эміграцыі, якую польская камуністычная партыя палітычна урабляла, інж. Рыдлеўскі пачаў шукаць магчымасьці неяк атайбавацца ў Францыі ды пачаць тут арганізацыйна-нацыянальна-палітычную працу, на чым яшчэ асабліва настайваў і прэз. Захарка.

Рыдлеўскаму давялося каля 3-х год працаваць нелегальна, пераяжджаючы з аднаго гораду ў іншы, выконваючы найцяжэйшыя працы, ад якіх мясцовыя работнікі адмаўляліся, каб утрымацца й неяк залегалізавацца ды не адарваца ад тагo арганізацыйнага беларускага жыцьця, якое было пачатае ў Вернэльe ля Ліёну напярэдадні Каляды ў 1929 г. й цэнтр якога быў перанесены ў 1931 годзе ў Парыж.

Толькі пасьля трох год цяжкой працы Рыдлеўскаму неяк выпадкам, праз недагляд паліцыі, удалося атрымаць права на працу (працоўную карту), пасьля чаго ягонае жыцьцё нарэшце палепшала. Маючы вялікія тэхнічныя здольнасьці й добрую агульна-тэхнічную падрыхтоўку — ён хутка пачынае зварачаць на сябе ўвагу адміністрацыі газава-электрычнае фабрыкі, куды яму ўдалося ўладзіцца на працу і ўжо за год робіцца няштатным заступнікам дырэктара гэтага прадпрыемства. Захопленая здольнасьцямі, выяўленымі пры перабудове фабрыкі, адміністрацыя намаўляе інж. Рыдлеўскага прыняць францускае грамадзянства, што дало-б яму права на дырэктарства іншае вялікае фабрыкі. Аднак, Рыдлеўскі, апанаваны адзінаю думкай вярнуцца некалі на Бацькаўшчыну, адмаўляецца ад гонару быць францускім падданым і дырэктарам фабрыкі й застаецца сьціпла аплачаным працоўнікам.

Выбух 2-ой Сусьветнай вайны паставіў беларускую эміграцыю ў Францыі ў вельмі няспрыяльнае палажэньне. Польскі экзыльны ўрад, які апынуўся неўзабаве у Францыі, займеў паводле польска-францускай вайсковай канвэнцыі права мабілізаваць і ўсіх беларусаў Зах. Беларусі ў польскую армію.

Змаганьне з палякамі ў абароне беларусаў было цяжкое і вельмі на той ваенны час небясьпечнае, але інж. Рыдлеўскі і тут аддаецца яму поўнасьцю. У выніку — францускі ўрад дазволіў беларусам дабраахвотна выбіраць, ці жадаюць яны ваяваць у польскіх аддзелах, ці у шэрагах „францускага легіёну на час вайны", прыракаючы ў будучыні фармаваньне нацыянальных палкоў, Рыдлеўскі, каб даць прыклад беларусам Францыі — запісаўся быў першым дабраахвотнікам у прыгаданы францускі легіён.

Неспадзявана хуткая акупацыя Францыі немцамі недазволіла на арганізацыю абяцанага французамі беларускага палку — хоць справа гэтая й стала на добрай дарозе (ужо запісалася было ў яго 1200 чалавек), і французы пасьпелі прыкамандыраваць толькі Рыдлеўскага да ўдарнага палку, кіненага на фронт.

Тут, як заўсёды, Рыдлеўскі таксама чэсна выканаў свой абавязак, бароначы імя й гонар беларуса. Калі полк ягоны быў блізу цалкам зьнішчаны, ён адыйшоў з колькімі сябрамі на поўдзень Францыі й далучыўся да францускіх партызанаў, змагаючыся ў лясох і ў горах супраць гітлераўцаў аж да прыходу войскаў ген. дэ-Голя.

Пасьля вызваленьня Францыі інж. Рыдлеўскі, замест таго, каб вярнуцца на сваю даўнейшую добрую пасаду, як заслужаны францускі ваяўнік, — згадзіўся застацца ў Парыжы дзеля арганізацыйнай беларускай працы.

Апынуўшыся ў сталіцы даслоўна бяз усялякіх сродкаў да жыцьця, ён пачынае аб'езд лягероў, вышукваe запалоханых, стэрарызаваных прымусовай рэпатрыяцыяй беларускіх вайскоўцаў і, карыстаючыся картай „рэзістанта" — дапамагае ім легалізавацца, выбаўляе ім дакуманты, уладжвае на працу.... Блізу два гады давялося інж. Рыдлеўскаму жыць гэтак не сваім жыцьцём, а жыцьцём іншых. Жывучы сам у цёмнай і цеснай нары, якую цяжка наагул назваць „кватэраю", ён ні ў дзень, ні ўначы не стамляўся шукаць кватэраў для тых, каго яму ўдалося вырваць з лягеру, ці тых, каму пашчасьціла самім уцячы зь яго. Галадуючы, ён вечна турбаваўся тым, як-бы накарміць іншых, бяз працы сам — ён бегаў па месьце, шукаючы працы беспрацоўным суродзічам. Нарэшце, не шкадуючы ні сілаў, ні здароўя, ён арганізуе Саюз беларускіх работнікаў пры францускім Хрысьціянскім Сындыкаце й атрымлівае дазвол на выдаваньне газэты „Беларускія навіны".

Мала лягчэйшаю справаю была для інж. Рыдлеўскага ў тыя часы й рэпрэзэнтацыя навонкі, але ён і тут дае сабе рады. Прыняўшы становішча сакратара Прэзыдыюму БНР, ён адыграў (асабліва ў 1947-49 г. г.) вялізарную ролю ў справе навязаньня кантактаў з вонкавым сьветам.

Прыгаданая праца інж. Рыдлеўскага ў гадох 1945-50 моцна падарвала ягонае здароўе. Ён пачаў хварэць, губляць энэргію, раптоўна старэць...

Каб падлячыць яго, даць яму належны адпачынак, якога ён ніколі ня мог-бы мець у Францыі, айцец Сіповіч запрасіў яго у Лёндан, у манастыр, куды Рыдлеўскі й пераехаў быў сёлета ў красавіку. Тут ён сьпярша пачаў хутка папраўляцца, набраў сілаў, заваліўся навуковай працай, падрыхтоўваючы бібліяграфію „Беларусікі" ў Брытанскім музэі, але хутка выявілася, што хвароба ягоная важнейшая, чымся здавалася. Усякая лекарская дапамога была ўжо спозьненай. Пасьля спробы апэрацыі, яго перанесьлі ў пакой, скуль, як ён сам сказаў, „ужо ня выходзяць, а вывозяць"... Дзень гэтага „вывазу", паводле выказваньня лекароў, меў надыйсьці не далей, як праз месяц. Гэтак і сталася...

Апошні раз я бачыўся з Лявонам Рыдлеўскім 5-га й 6-га кастрычніка. Пазнаў яго толькі па голасе. Ледзь прывітаўшыся са мной ён адразу ў мяне запытаўся — як справы? Але пабачыўшы мой усхваляваны твар, пачаў сам аналізаваць агульнае палажэньне й раіць мне, што й як рабіць. Я пабачыў, што ня гледзячы на цяжкі стан, ён усьцяж у курсе ўсіх падзеяў, аб чым сьветчылі й ангельскія, францускія ды беларускія газэты на ложку й каля яго. Я намагаўся трапіць у тон ягоным гутаркі, але мне не ўдавалася. Боль сьціскаў мне грудзі й я адварачваўся, каб схаваць ад хворага непаўстрымныя сьлёзы. У другім куце шпітальнага пакою, гэткі-ж жудасна худы чалавек, як Рыдлеўскі, моўчкі, бяз стогну, кідаўся на ложку. Пабачыўшы, што я прыглядаюся да яго, Рыдлеўскі зазываючы: — „Бачыш, якія гэтыя ангельцы джэнтльмэны. Чалавек гэты паміраe, а бачыш, які ціхі. Гэтак памерла ўжо тут на маіх вачох трое. Вось і гэты сусед, — і ён паказаў рукой на іншага хворага, — таксама незадоўга памрэ, але тут, брат, ніхто ня войкае, ня стогне — джэнтльмэны да апошняе мінуты"...

А ў маіх думках паўстаў даўгі фільм нясупынных, з мелянечкімі адно перапынкамі, пакутаў, што давялося перажыць Лявону Рыдлеўскаму напрацягу жыцьця. Мільгануў уваччу ягоны парыскі „пакойчык" — вымоўны сымбаль, які найлепш характарызаваў Рыдлеўскага, як аднаго з найахвярнейшых, найцярплівейшых ідэалістых-змагароў за нечую, толькі не сваю, долю, зьліўся ў адно з гэтым ягоным апошнім прыпынкам — шпітальным пакоем, насычаным нявымоўным людзкім цярпеньнем, бясслоўным болем...

І мне хацелася сказаць: — „Так, браце Лявон, ты праўжы сваё жыцьцё, як запраўдны джэнтльмэн. Напрацягу больш 30-цёх гадоў ты аддаваў людзям усё, што мог, а часта й больш, чымся мог, цярпеў таксама больш, чымся мог, не наракаючы, не дакучаючы нікому..." Але я не сказаў нічога.

Выбач мне, дарагі, любы сябра. Памяць аб табе застанецца ў сэрцах тых, якіх ты так аддана кахаў, будзе пераказвацца тым, каму ты прысьвяціў сваё жыцьцё...

Вечная табе памяць!

Мікола

ВЯЛІКАЯ НАРОДНАЯ ОПЭРА

(Абрад беларускага вясельля)

Дзяленьне караваю — вельмі ўрачысты момант беларускага вясельля. Калі надыходзіць пара дзяліць яго й дарыць маладых, да маладое падыходзяць ейныя сяброўкі й здымаюць самперш з ейнае галавы вясельны вянок, а тады вядуць маладых на сярэдзіну хаты й садзяць побач „на пасадзе". Тымчасам сват із дружбаю йдуць у камору па каравай. Нясуць яны яго ў хату ўрачыста, з песьнямі. Сват трымае яго, высака узьняўшы над галавой, а дружкі сьпяваюць:

— „Нясіце каравай, нясіце,
Палажыце яго на стале,
Палажыце яго на стале,
Ды на белым, белым абрусе.
Сталовыя ножкі гіблюцца,
Усе з караваю дзіўлюцца..."

Тымчасам, маладая зьвяртаецца, плачучы, да бацькі й паміж імі завязваецца дыялёг:

— „Татулька мой родненькі, — просіць маладая, — дары мяне".

— „Дзіцятка маё роднае, чым-жа цябе дарыць" — пытае таксама ўзрушаны бацька.

— „Татулька мой родны", — адказвае маладая — "хлебом і сольлю,

Хлебам і сольлю, добрым здароўем..."

Гэткі самы дыялёг паўтараецца й паміж дачкою й маці. Дружкі-ж у гэтым часе, няспыняючы, сьпяваюць зваротку песьні:

— „Добрая твая, Марылька, доля,
Што твой татка цябе дора.
Шчасьлівая будзе гадзіна,
Цябе дорыць уся радзіна.

Пад гукі гэтае песьні бацькі падыходзяць да маладых і дораць іх, пераважна грашыма, часта не малымі, што залічаецца ў пасаг. За бацькамі падыходзяць „дарыць" маладых бліжэйшыя сваякі, а тады й госьці. Кажнаму зь іх сват, які увесь час заклікае на ўсю хату прысутных не марудзіць і дарыць маладых, падае па лустачцы караваю, якую выпадае браць з ягоных рук вельмі асьцярожна, праз чыстую белую хустачку й есьці з павагаю й паволі.

Апошні акт гучнага беларускага вясельля, пераплеценага песьнямі, жартамі й сьлязіма — гэта ад'езд маладой да малодага й разьвітаньне яе з бацькамі, із сваякамі, з роднай хатай і нівай.

Маладая нізка схіляецца на ўсе чатыры куты хаты, кланяецца асобна сьвятым абразом на покуці, печы, сталу й лавам, прыгаварваючы й заліваючыся сьлязьмі:

— „Таткаў куточак, Божы дамочак,
Заставайся здароў, жыві багата"...

Асаблівa роспачнае разьвітаньне маладое з маці. Тут ужо сьлязам і жалясным песьням няма канца, тым балей, што жаль гэтае часіны запраўды і шчыры й глыбокі. Да цыклю беларускіх разьвітальных песьняў, сьпяваных на нашых вясельлях, належыць і вельмі цікавая й своеасаблівая песьня, гэтак удала скарыстаная камп. Куліковічам у 3-ім акце ягонае опэры „Лясное возера" (лібрэта Н. Арсеньневай). Гэта арыгінальная, за-

(Канец на 4-ай бал.)

Гаспадарствы Заходу мелі-б тады магчымасьць раз і на заўсёды спыніць кажную экспансію на абшарах Эўропы й моцна стануць на шляху пэўнага й трывалага супакою, робячы канцы із сумнае памяці эпохай мілітарызму „старога кантынэнту".

На фоне згаданага распадзелу сілаў палажэньне паняволеных народаў выглядае ня гэтак ужо дрэнна.

Можа гэта й гучыць, як парадокс, але час у сваёй непазьбеглай кансэнквэнцыі працуе на іхную карысьць. І само жыцьцё вызначае ім бясспрэчную вырашальную ролю.

Сяньня народы гэтыя наважна, не шкадуючы ахвяраў, змагаюцца з краінай, якая рыхтуецца да апошняга скоку дзеля апанаваньня сьветам. Яны будуць змагацца й надалей з кажным захопнікам, які будзе імкнуцца да паняволеньня іх, да адабраньня іхнае незалежнасьці ў будучыні. Сам лёс прызначыў гэтыя народы дашчыльнага супрацоўніцтва з усімі, хто змагаецца й будзе змагацца супраць прыгаданых тут паняволнікаў.

Ужо сяньня, калі дзяржавы, якія бароняцца супраць агрэсара, будуць хацець запраўды разумна супрацоўнічаць палітычна з паняволенымі народамі, яны атрымаюць падмогу, што ўжо на пачатку крывавага сутыку зробіць канцы із доўгатрывалай і злавеснай пагрозай усёзьнішчальнае новае вайны.

А калі не захочуць, што тады?

Тады — справа ясная. Ваенную моц ворага й ягоны дзяржаўны апарат лёгка ўдасца зьнішчыць прыладамі сучаснае тэхнікі — атамнымі ды вадароднымі бомбамі й інш. Аднак, маючы й сотні гэткіх бомбаў, немагчыма будзе стварыць ніякага новага арганічнага жыцьця з жахлівага нялюду, паўсталага на прасторах, апанаваных Расеяй.

Як мы ўжо бачылі з папярэдняга, якраз гэты пасьляваенны час будаваньня й арганізаваньня й быў якраз тою паразаю, якая чакала ўрэшце кажнага здабывальніка расейскіх бязьмежжаў. Гэтую сваю своеасаблівасьць Расея ведае й залічае ў лік сваіх козыраў. Пабіць гэтыя козыры не патрапіць ніхто, калі да гэтага ня спрычыніцца паняволеныя Расеяй народы.

Кажнае гаспадарства, якое будзе лёгкадумна ставіцца да прыгаданай своеасаблівасьці, праліе шмат крыві, пакладзе безьліч ахвяраў, бо ўсё-ж без дапамогі паняволеных народаў не абыйдзецца. Аб гэтым выменчна сьветчаць гады 1812, 1918 і 1943.

Ніякая наймагутнейшая, навет, ваенная акупацыя ня можа трываць вечна. Раней ці пазьней яна мусіць спыніцца. І тады прыходзіць пара гвалтоўных і наважных зьменаў.

Таксама й справа трывалага міру ня можа быць абапёртая на вайне з Расеяй іншага якога імпэрыялістычнага ейнага ворага. У гэтым выпадку ўсё, што ўдасца асягнуць, будзе — адкінуць ворага за тую ці іншую геаграфічную мяжу рэкаў ці пасма гор, дый то адно на нядоўгі час. Неўзабаве-ж змаганьне пачнецца ізноў ў выглядзе цэлага шэрагу новых войнаў у стылі Напалеонскія войнаў, або „Трох сусьветных войнаў" XX стагодзьдзя. А на перапатрываньне іх сьвет ня мае ні моцы, ні магчымасьцяў. Адно, што можа даць яму пажаданы супакой і лад, — гэта наважнасьць на станоўкае задавоненьне жаданьняў паняволеных народаў.

Абодвы гэтыя пытаньні: трывалы супакой і вызваленьне паняволеных народаў непарыўна міжсобку зьвязаныя. Паняволеныя народы ня могуць быць вызваленыя бяз новае вайны ў імя ўсяго чалавецтва супраць імпэрыялізму, які напружвае сяньня свае цягліцы да апошняга скоку, да апанаваньня ўсяго сьвету. З іншага боку, ваенная перамога над імпэрыялізмам з усходу ня дасьць сьвету пажаданага супакою, калі паняволеныя народы ня будуць раз і назаўсёды вызваленыя з няволі.

Прыгаданую непазьбегласьць мусілі добра зразумець палітычныя мужы, якія выявілі мэты свайго змаганьня ў зьмесьце Атлянтыцкае Хартыі.

Аднак, ці за дакладным зразуменьнем праўды надыйдзе й ужыцьцёўленьне яе, пакажа будучыня ды колькасьць намаганьняў і ахвяраў, якія чалавецтва змушанае будзе ўкласьці ў справу перамогі над перашкодамі, што стаяць перад ім.

У кажным разе, справа гэтая выйшла ўжо з межаў прыгожых і ўзьнёслых гутарак і узыйшла на шлях наважнага вырашэньня яе чынамі ды дзеямі.

В. Нануашвілі
1947 г.

†

ГАЛОЎНАЯ УПРАВА ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ ВЭТЭРАНАЎ І КАМБАНТАНТАЎ

із запраўдным жалем паведамляе аб перадчаснай сьмерці сябры Задзіночаньня, слуцкага паўстанца

інж. ЛЯВОНА РЫДЛЕЎСКАГА

Вечная памяць няўтомнаму змагару за Незалежнасьць Беларусі!

Галоўная Управа Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў і Камбатантаў

†

КААРДЫНАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСКІХ АРГНІЗАЦЫЯЎ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

паведамляе з сумам аб сьмерці

інж. ЛЯВОНА РЫДЛЕЎСКАГА

заслужанага дзеяча беларускага адраджэнскага руху, сябры Рады БНР і сябры шматлікіх беларускіх і міжнародных арганізацыяў, якая наступіла пасьля цяжкой хваробы і пасьля прыняцьця Сьвятых Тайнаў дня 24-га кастрычніка 1953 г. у шпіталі сьв. Каломба у Лёндане.

Паховіны адбыліся ў панядзелак 2-га лістапада.

†

24 КАСТРЫЧНІКА 1953 г. ПАМЁР У ЛЁНДАНЕ

інж. ЛЯВОН РЫДЛЕЎСКІ

народжаны 2. X. 1903 г. у м. УЛЬЯНАВІЧА

СЯБРА БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТУ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА

аб чым з глыбокім сумам паведамляе

Управа Інстытуту

ВЯЛІКАЯ НАРОДНАЯ ОПЭРА

(Абрад беларускага вясельля)

пісаная аўтарам лібрэта на Воложыншчыне, тужлівая песьня:

— „Ой, гара з гарой разьлягаецца,
Божа-ж мой,
Дзевачка з мамачкай разлучаецца,
Божа-ж мой,
Ой, ляпей было ня любіціся,
Божа-ж мой,
Як цяпер з мамачкай разлучыціся,
Божа-ж мой,
Ой, ляпей было не кахаціся,
Божа-ж мой,
Як цяпер з мамачкай разьвітаціся,
Божа-ж мой"...

Пад гукі гэтае песьні маладая часта гэтак шчыра плача, што зусім зьнясільваецца й яе даводзіцца падтрымліваць, каб яна не ўпала. Яна ня сьціхае галасіць і сядаючы на воз. Гэтак, горка плачучы, яна й ад'яжджае на „новае шчасьце й долю"...

А ў сялібе маладога ўжо даўно прырыхтаваныя на сустрэчу маладых і гасьцей. Калі вясельная дружына ўяжджае

Вязем нявестку, як сонца,
Адчыні, матулька, ваконца,
Прывязьлі табе нявестку сварыцца"...

Але пакуль што аб сварках яшчэ няма мовы. Сьвёкар і сьвякруха баслаўляюць і сына й нявестку й вядуць у хату. Усе ізноў сядаюць за стол і балянаньне, песьні ды скокі пачынаюцца нанова.

На трэці дзень пасьля шлюбу, г. зв. „прыданкі" прывозяць пасаг маладой. на двор сялібы, сьвёкар і сьвякруха абсыпаюць прыбылых аўсом. У варотах пад воз маладых часта падсыцаюць кажух, воўнай дагары. Усё гэта, як мы ўжо прыгадвалі, мае даць ім долю й багацьце. Дружкі-ж, высыпаўшы на ганак, у гэтым часе сьпяваюць:

— „Адчыні, матулька, новы двор,
Вязём нявестку, як явор.
Адчыні, матулька, ваконца,
Узьяжджаючы на двор маладых, яны сьпяваюць:
— „А выйдзі, Ганячка, на ганак,
Паглядзі сваіх прыданак.
Ці зязюлечкі кукуюць,
Ці салавейкі шчабечуць?
Не зязюленькі кукуюць,
Не салавейкі шчабечуць.
Гэта мае дзядзькі гойкаюць,
Гэта мае цётачкі песьні пяюць,
На маёй скрыні седзячы,
На маю староньку гледзячы"...

Канчаецца-ж беларускае вясельле шчырым, хоць мо' й ня зусім вэтлым прыпамінам-зваротам да сватоў ды гасьцей, разласаваных, але й стомленых доўгім балянаньнем:

— „Едзьце, сваты, дадому, дадому,
Паелі коні салому, салому,
Каля плоту крапіву, крапіву,
У застронках мякіну, мякіну"...

На гэткія запросіны адна рада — ехаць дамоў — і неўзабаве й сваты й госьці ад'яжджаюць. Заціхаюць песьні й музыка... У хаце, што грымела столькі дзён ад тупату жвавых ног, ад песьняў, жартаў і сьмеху — робіцца ціха й дзіўна маркотна.

А назаўтрае — пачынаецца ўжо штодзённае жыцьцё, зь ягонаю працаю, зь ягонымі дробнымі радасьцямі й вялікімі турботамі, тое замужняе жыцьцё, якое ў беларускіх песьнях прадстаўляецца часта вялікім няшчасьцем, ад якога дзяўчына жаласна просіць ратунку:

— „Ды ў нядзельку ранен ька
Сіне мора трапяталася,
Сонейка купалася,
А дзеванька ратавала,
Ды ратуючы, сама ўпала.
— „Татачка мой родненькі,
Ды выратуй мяне з мора,
Зь вялікага гора".
— „Дзіцятка маё роднае,
Чаму раней ты не казала,
Як белых ручак ды не вязала,
Жоўтых пярсьцёнкаў ды не мяняла"...

К.

З Беларускага Жыцьця

Беларуская моладзь у Лэйбор Тэмпл

Як мы ўжо ўспаміналі ў папярэднім нумары нашае газэты, 22-га кастрычніка сёлета нашыя будучыя спадкаемцы, задзіночаныя ў Згуртаваньні Беларускае Моладзі (ЗБМ), былі запрошаныя ўзяць удзел у першым канцэрце г. зв. „Фэстывалю вакол сьвету" — шэрагу міжнацыянальных мастацкіх выступленьняў, прысьвечаных арганізацыі Задзіночаных Нацыяў. У канцэрце гэтым,ладжаным у залі Лэйбор Тэмпль у Нью-Ёрку, побач зь іншымі нацыянальнасьцямі, удала выступілі й нашыя маладыя сьпявакі, сьпявачкі ды танцоркі.

Канцэрт быў на высокім мастацкім узроўні. Выступалі на ім пераважна прафэсыйныя мастакі, як, прыкладам выканальніца народных ангельскіх песьняў сп-ня Вікторыя Кінсьлі з Лёндану, кітайская балярына Грэйс Гсу з Шанхаю, піяністка Ж. Кортлэнд і нязвычайны барытон, дазнаны опэрны сьпявак др. Піліп Бонд. Аднак, усе гэтыя выступленьні, хоць і каштоўныя ды цікавыя, нічога асаблівa новага да праграмы вечару не дадалі, калі ня лічыць выступленьня маладзенькае кітайскае балярыны, якая на мастацку выканала два клясычныя кітайскія танцы, упрыгожыла шчыра ўвагі бачанья бальшынёю беларусаў, прысутных на канцэрце.

Затое запраўднай сэнсацыяй вечару было выступленьне на сцэне нашае беларускае групы моладзі, падрыхтаванай Галінай Ганчарэнка. Само зьяўленьне перад гледачамі нашых прыгожа й старанна прыбраных у нацыянальную вопратку мілых дзяўчатак ды хлапцоў выклікала буру воплескаў сабраных. Пасьля выканаьня нашым хорам дзьвух народных песьняў беларуская моладзь была выкліканая „на біс". Яшчэ лепш удаўся ды спадабаўся ўсім танец „Лявоніха", выкананы групкаю дзяўчат. Наагул, удзел нашае моладзі ў канцэрце быў вельмі добраю думкаю, бо шмат хто з прысутных на ім гасьцей, між якімі былі й амбасадары ды інш. прадстаўнікі палітычнага сьвету, упяршыню пачулі тут беларускую песьню ды пабачылі беларускі танец. А паказ нашага мастацтва — гэта вельмі добры спосаб азнаёмленьня чужынцаў із намі, нашым народам і нашай Бацькаўшчынай.

Як мы даведаліся, ЗБМ ужо атрымала цёплую падзяку ад арганізатараў канцэрту за сваё ўдалае выступленьне й запросіны выступіць неўзабаве яшчэ, гэтым разам ужо зь вялікім, на цэлы вечар, беларускім канцэртам.

Прысутны.

Да беларускае эміграцыі у ЗША

Надыходзіць вялікае сьвята — Каляды. Кажны з нас, працоўных вольнага сьвету, маніцца сустрэць яго радасна, у дастатку й супакоі.

Але сьвяткуючы Дзень Хрыстовага Нараджаньня пры багатым сьвяточным стале, не забудзьма-ж, браты беларусы, нашых нешчасьлівых братоў, расьцярушаных па сьвеце, якія ў гэты урачысты дзень будуць глытаць гаркія сьлёзы турботаў і адзіноты, ня маючы нічога, чым яны маглі-б пацешыць сваіх дзетак і сябе.

Каб ня спозьніцца із дапамогаю ім — зараз-жа складайце грашовыя ахвяры ці праз свае арганізацыі, ці індывідуальна й высылайце ў Беларускі Камітэт у Нямеччыне, у Францыі й інш. а таксама у Аддзел Сацыяльнае Апекі Галоўнае Управы БАЗА, бо апрача сяброў прыгадаых Беларускіх Камітэтаў, мы маем шмат абяздоленых людзей, раскіненых па іншых краінах сьвету, якія беспасярэдна зьвяртаюцца да Аддзелу Сацыяльнае Апекі БАЗА лістоўна, просячы дапамогі.

Выкарыстайце таксама добры прыклад мінулага году — калядную дапамогу нашым эўрапэйскім суродзічам пад клічам „дзеці — дзецям". Дапамога гэтая прыняясе шмат радасных часінаў нашым бедным малым за морам, а таксама будзе й добрым узгадавальным момантам для вашых собскіх дзяцей тут і бясспрэчна, западзе добрым зернем у дзіцячыя сэрцы.

Грошы й пачкі з вопраткай высылайце беспасярэдна на адрыс Камітэту ў Нямеччыне, паведамляючы аб гэтым Аддзел Сацыяльнае Апекі БАЗА дзеля статыстыкі й апублікаваньня ў прэсе.

Адрас Беларускага Камітэту ў Нямеччыне:

München 22, Herzog Rudolf Strasse

Аддзел Сацыяльнае Апекі БАЗА.

У БЕЛАРУСКІМ ІНСТЫТУЦЕ НАВУКІ И МАСТАЦТВА

Каб навязаць цясьнейшую лучнасьць між расьцярушанымі па сьвеце сябрамі Інстытуту ды дзеля актывізацыі навукова-беларусаведнай і творчай беларускай культурнай працы, Управа БІНіМ пачынае выдаваць Абежнік, які будзе выходзіць пэрыядычна, у меру патрэбы, аднак, не радзей, як чатыры разы ў год. Усе сябры Інстытуту, якіх налічваецца ўжо на сяньня звыш 60-цёх, заклікаюцца Управай Інстытуту да супрацоўніцтва ў Абежніку праз дасылку ў яго прапановаў, заўвагаў і паведамленьняў.

Між іншага, Управа Інстытуту зьвяртае ў Абежніку ўвагу сваіх сяброў на неабходнасьць памацненьня актыўнасьці сяброў БІНіМ ня толькі сярод сваіго, але асабліва сярод чужога грамадзтва. Сябры Інстытуту заклікаюцца да ўдзелу ў навуковых паседжаньнях і дыскусіях іншанацыянальных навуковых і культурных арганізацыяў і установаў, у першую-ж чаргу на тых, дзе закранаюцца беларускія пытаньні. Гэткі заўсёдны, жывы сутык з чужанацыянальнымі навукова-інтэлектуальнымі коламі можа ў вялікай меры пашырыць ды паглыбіць пазнаньне ды належнае разуменьне чужынцамі пытаньняў беларусаведы ды узьняць аўтарытэт беларускіх навуковых кадраў у вачох чужынцаў.

ПАДЗЯКА

Управа Аддзелу БАЗА Саўт-Рывэр — Нью-Брансьвік складае сваю шчырую падзяку усім тым, хто зладжыў ахвяры на „Калядны падарунак" суродзічам у Эўропе.

Ахвяры зложылі:

1.	А. Стагановіч	$ 5.00
2.	В. Стома	$ 5.00
3.	А. Корбут	$ 3.00
4.	Бітус	$ 2.50
5.	Хмялеўская Ніна	$ 2.00
6.	А. Рудак	$ 1.00
7.	Я. Місюль	$ 1.00
8.	А. Круцько	$ 1.00
9.	Вольга Сільвановіч	$1.00
10.	Ул. Харавец	$ 1.00
11.	А. Балкоўскі	$ 1.00
12.	Ул. Лосік	$ 1.00
13.	А. Будзька	$ 1.00
14.	Ч. Ханяўка	$ 5.00
15.	Н. Дубяга	$ 2.00
16.	Ф. Дубяга	$ 2.00
17.	Даніловіч Б.	$ 10.00
18.	Кажура П.	$ 3.00
19.	Тэрэбей М.	$ 1.00
20.	Філановіч Д.	$ 1.00
21.	Азарка Янка	$ 1.00
22.	Кабушка Вера	$ 2.00
23.	М. М.	$ 1.00
24.	Чыгіровіч Янка	$ 3.00
25.	Русак В.	$ 3.00
26.	Родзька Ф.	$ 3.00
27.	Лабовіч М.	$ 2.00
28.	Раманаў А.	$ 1.00
29.	Бабёр Васіль	$ 5.00
30.	Бабёр Разалія	$ 1.00
31.	Войтанка М.	$ 1.00
32.	Каранеўскі М.	$ 2.00
33.	Гэльвіг Галіна	$ 0.50
34.	Барысэвіч Я.	$ 1.00
35.	Зіневіч С.	$ 1.00
36.	Грузд В.	$ 3.00
	Разам	$ 85.00

ПАДЗЯКА

Управа Аддзелу БАЗА Саўт-Рывэр і Нью-Брансьвік складае гэтым сваю шчырую падзяку ніжэй пададзеным асобам, якія далі свае ахвяры на помнік сьв. пам. кампазытара М. Равенскага.

1.	Азарка Янка	$ 5.00
2.	Даніловіч Браніслаў	$ 5.00
3.	Ханяўка Часлаў	$ 5.00
4.	Стома Васіль	$ 5.00
5.	Стагановіч Аляксандар	$ 5.00
6.	Родзька Ф. і Русак В.	$ 5.00
7.	Дзядовіч Дзьмітры	$ 2.00
8.	Каранеўскі Флярыян	$ 1.00
9.	Машанскі Уладз.	$ 2.00
10.	Кабушка Ул.	$ 5.00
11.	Войтанка М.	$ 1.00
12.	Балкоўскі Аляксей	$ 1.00
13.	Корбут Алесь	$ 2.00
14.	Будзька Антось	$ 1.00
15.	Кажура Пётра	$ 2.00
16.	Бітус і Хмялеўская	$ 5.00
17.	Круцька Аўгеня	$ 0.50
18.	Місюль Янка	$ 0.50
19.	Кудасаў А.	$ 1.00
20.	Вініцкі Ярaслаў	$ 5.00
21.	Бабёр Васіль	$ 5.00
22.	Дубяга Ганна	$ 1.00
23.	Сільвановіч Міхась	$ 1.00
24.	Дубяга Зося	$ 1.00
	Разам	$ 67.00

ЧАЦЬВЕРТЫ КАНГРЭС ЦБАА.

У Лювэне (Бэльгія) адбыўся ў канцы мінулага месяца 4-ты Кангрэс Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў. У новую Управу арганізацыі ўвайшлі: сп. Цьвірка — як старшыня, айцец Смаршчок — як старшыня Студ. Стыпэндыяльнага Фонду й сп. сп. др. Набагез, Арэшка, Занковіч і Мак-як сябры ўраду.

ПРЫКЛАД АХВЯРНАСЬЦІ

Беларускія сем'і, якія жывуць на Мэспэце ў Нью-Ёрку ўжо шчыра ўзяліся за справу каляднае дапамогі суродзічам у Нямеччыне. На іхную просьбу, Беларускі Нацыянальны Камітэт у Мюнхэне прыслаў ім сьпіс беларускіх сем'яў у Эўропе, якія патрабуюць дапамогі, й нашыя мэспэцкія беларусы пасылаюць неўзабаве усім ім сьвяточны пачкі ці грошы.

Сям'і Маркоўскага Мікалая высылаюць пачку з вопраткай і еміна́й сп-ства Арцюхі,

Сям'і Шалудкевічаў (маці із 6 гадовым сынам) высылае гэткую-ж пачку сп-ня Рыттэр,

Сям'і Саўчанкаў А. і М. з 4 дзяцьмі высылаюць пачку сп-ства Стаськевічы,

Сям'і Сысоеў высылаюць пачку з вопраткай і 5 дал. сп-ства Панькоўы,

Сям'і Турчыновічаў шлюць пачку сп-ства Гарошкі,

Хвораму А. Сьміглу — шлюць 5 дал сп-ства Н. і Ул. Кушалі,

Т. Барысіку 3 дал. сп-ва Грушы,

Хвораму Н. Акулічу — 5 дал. сп-ства Заруцкія,

Вязьню Каз. Багдановічу — шлюць 5 дал. сп-ства С-к,

Сям'і Кулагіных — шле 5 дал. сп. Бунчук.

На гэтым, аднак, дапамога мэспэцкіх беларусаў суродзічам у Нямеччыне не абмежваецца. Яны зьбіраюць цяпер сярод беларусаў-старых эміграантаў свае ваколіцы грошы, якія таксама будуць перадазаны Беларускаму Камітэту ў Мюнхэне.

Ліст у Рэдакцыю „Беларуса" ад Камітэту Пабудовы Бел. Народнага Дому

Ужо хутка будзе год, як 4-ты Кангрэс БАЗА пастанавіў прыступіць да збору сродкаў для набыцьця Беларускага Дому ў Нью-Ёрку. Выбраная Камісія адразу узялася за выкананьне гэтай вельмі важнай для нас пастановы. Рассылаліся й раздаваліся пры ўсякай нагодзе надрукаваныя Дэклярацыі, якія заклікалі беларусаў уплачваць паі ў вышыні 50 даляраў. Пісаліся таксама у гэтай справе звароты й артыкулы ў газэту „Беларус". Аднак, да гэтага часу толькі некаторыя асобы ўнесьлі грошы ў фонд. Значная частка беларусаў яшчэ ня выканала свайго грамадзкага абавязку. Нядаўна на імя Камісіі паступіла прапанова ад Аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі. Паколькі гэтая прапанова вельмі рэчавая й добрая, мы зьмяшчаем яе тут поўнасьцю:

„Не зважаючы на рассылку Дэклярацыяў праз друк ад імя Камісіі для набыцьця Беларускага Дому, грошы яшчэ не сабраныя. Нам здаецца, што трэба знайсьці іншы спосаб для збору сродкаў на гэтую мэту, а менавіта: разаслаць усім Аддзелам БАЗА формы, каб яны ад сябе апыталі кажную асобу, колькі яна можа даць зараз, а колькі абяцае даць пазьней. Калі-ж нехта зусім адмовіцца, дык і гэта добра ведаць. Гэткае апытаньне неабходна правесьці як найхутчэй. Пасьля правядзеньня такое акцыі Камісія будзе ведаць, на якія сумы яна можа лічыць і хто зьяўляецца запраўдным беларусам.

І Вы й мы вадаем, што гэта цяжкая праца, але іншага выхаду мы ня бачым, бо без Беларускага Дому ў Нью-Ёрку немагчыма адпаведна весьці ані навуковую, ані наагул нашую грамадзкую працу. Набыцьцё Беларускага Дому — гэта экзамен нашае грамадзкае сэпеласьці, важнае апраўданьне нашага існаваньня здалёка ад Бацькаўшчыны. Выканаўшы гэтае сваё заданьне, мы засьветчым, што навучыліся дзяржаўна думаць, калі-ж не, дык перад намі стаіць пагроза, што й нашая новая эміграцыя можа пайсьці шляхам старое, страчанае ў бальшыні выпадкаў для Бацькаўшчыны й нашае справы. Вынік будзе нязвычайна сумны.

Урэшце, мы просім Камісію не пакрыўдзіцца нашай прапановай, бо мы маем на ўвазе толькі нашае агульнае дабро. Мы ня ведаем, ці наш спосаб дасьць пажаданыя вынікі, але мы з практыкі нашага гуртка сьцьвердзілі, што калі мы пачалі апытваць нашых сяброў, дык сякія-такія вынікі ўжо ёсьць. Зазначаем, што бальшыня нашых сяброў ужо й раней заахвяравала поўны пай".

Аддзел БАЗА ў Нью-Джэрзі

Упаўнаважаны **Я. Гладкі**

НА ФОНД НАБЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАГА ДОМУ ПАСТУПІЛА:

А. Корбут	**50 дал.**
Ул. Машанскі	**50 дал.**
П. М.	**50 дал.**
З папярэднімі	**2225 дал.**